— Трэба, сынку, хутчэй несці чаплю дахаты, — сказаў бацька. — Браканьеры яе паранілі, крыльцы падбілі... *(Паводле В. Праўдзіна).*

Спішыце першы тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары.
Вусна складзіце некалькі сказаў, каб закончыць апавяданне.
Разгледзьце фотаздымкі. Па якіх прыметах вы пазналі птушак?

**У маўленні прыметнікі выкарыстоўваюцца для таго, каб:**
- **падкрэсліць адметныя прыметы прадмета;**
- **стварыць яркае вобразнае апісанне;**
- **паказаць стаўленне аўтара да прадмета, з'явы, падзеі.**

**266.** Аднавіце фразеалагізмы, устанавіўшы адпаведнасць паміж словамі першага і другога слупкоў. Запішыце ўстойлівыя выразы, ужываючы прыметнікі ў патрэбнай форме. Вызначце канчаткі прыметнікаў.

| | |
|---|---|
| бабін | край |
| малочны | рэкі |
| пярэдні | грамата |
| кітайскі | лета |

Які фразеалагізм мае значэнне 'тое, у чым цяжка разабрацца'?

## § 44. Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі

**267.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Вожык — адзін з любімых п..рсанажаў народных казак і дзіцячых мультфільмаў. Гэты звярок — л..сны жыхар. Ён харчуецца нас..комымі. Але часам можа і птушынае гн..здзечка разарыць.

Галоўнай асаблівасцю вожыка з'яўляюцца вострыя іголкі на спіне[ф] і баках. Яны ўтварыліся ў далёкіх вожыкавых продкаў з валасянога[с] покрыва і служаць надзейнай аховай маленькага звярка ад злых ворагаў *(Паводле Г. Аўласенкі).*

Выпішыце з тэксту прыметнікі, што абазначаюць прыметы прадметаў паводле: 1) якасці, знешняга выгляду, памеру; 2) адносін да прадмета, асобы, месца; 3) прыналежнасці жывёле.

Спішыце першы абзац, устаўляючы прапушчаныя літары.



Правообладатель Национальный институт образования

Паводле значэння прыметнікі падзяляюцца на якасныя, адносныя і прыналежныя.

**Якасныя** прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх якасцей і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?: *добры, упэўнены, чырвоны, спелы*.

Якасныя прыметнікі могуць спалучацца са словамі ***вельмі, надта***: *вельмі дарагі, надта здольны*.

**Адносныя** прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх адносін да прадмета, асобы і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?: *шаўковы пояс — пояс з шоўку, дзіцячая пляцоўка — пляцоўка для дзяцей*.

**Прыналежныя** прыметнікі абазначаюць прыметы прадметаў паводле іх прыналежнасці пэўнай асобе ці жывёле і адказваюць на пытанні чый? чыя? чыё? чые?: *мамін голас, баброва плаціна, Васількоў сшытак, Ірынін пенал*.

Адносныя і прыналежныя прыметнікі не могуць спалучацца са словамі ***вельмі, надта***.

**268.** Прачытайце табліцу.

<table>
<tr><th colspan="4">Разрады прыметнікаў па значэнні</th></tr>
<tr><td rowspan="5">Якасныя</td><th colspan="3">Назвы прымет паводле:</th></tr>
<tr><td>• формы і памеру: шырокая дарога, круглы стол;<br>• колеру і масці: сіняе неба, буланы конь;<br>• смаку і паху: горкі палын, духмяны хлеб;<br>• фізічных асаблівасцей: высокі сусед, кульгавае цяля;<br>• рыс характару і разумовых здольнасцей: шчырая сяброўка, кемлівае дзіця</td><td>Адносныя</td><td>адносін да:<br>• асобы: дзіцячыя цацкі, вучнёўскі сшытак;<br>• прадмета: камп'ютарны стол, тэлефонны даведнік;<br>• матэрыялу ці рэчыва: ільняны ручнік, аўсяная каша;<br>• месца: вясковы жыхар, лугавая кветка;<br>• часу: вясенні гром, учарашні дзень</td></tr>
<tr><th colspan="3">Прыналежныя</th></tr>
<tr><td>• прыналежнасці асобе: татаў шалік, Антосеў смартфон</td><td></td><td>• прыналежнасці жывёле: буслава гняздо, лісіная нара</td></tr>
</table>



Правообладатель Национальный институт образования

**269.** Прачытайце прыметнікі і растлумачце іх значэнні. Вызначце, да якога разраду яны адносяцца.

Светлы, медны, ластаўчын, сакавіты, чорна-белы, заўтрашні, Надзеін[ф], асенні, упарты, гняды, дзядулеў, добразычлівы, бацькоўскі, вусаты, Коласаў, школьны, мядовы, бабулін, шырокі.

З адным прыметнікам кожнага разраду складзіце словазлучэнне.

***Звярніце ўвагу!***

Якасныя прыметнікі могуць ужывацца ў кароткай форме.

**Кароткая форма** прыметніка ў назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду мае нулявы канчатак: *сын дуж*□, *хлеб горак*□; у жаночым і ніякім родзе — канчатак **-а**: *праца салодк*[а], *дзіця шчаслів*[а]; у множным ліку — канчатак **-ы (-і)**: *вучні гатов*[ы], *мясціны дараг*[і].

У сказе кароткая форма прыметніка выконвае ролю выказніка: *Печ прыгорне* * *нас, як матка, добра там, дзе я **здароў*** (Я. Колас).

**270.** Прачытайце. Растлумачце сэнс прыказак. Выпішыце са сказаў кароткія прыметнікі. Падбярыце да іх адпаведныя прыметнікі ў поўнай форме.

Узор: *повен*□ — *поўн*[ы], *поўн*[а] — *поўн*[ая], *поўн*[ы] — *поўн*[ыя].

1. Горка часам праца, ды хлеб ад яе салодкі[с]. 2. Не той харош, хто з твару прыгож, а той харош, хто на справу гож. 3. Вясна кветкамі багата, а восень з пірагамі ў хату. 4. Ён хоць і не багат, але госцю рад. 5. І ваўкі сыты, і козы цэлы.

Якое значэнне мае слова *гож* у другім сказе: а) ‘прыгодны для якіх-небудзь мэт’; б) ‘прывабны’?

**271.** Складзіце словазлучэнні «прыметнік + назоўнік». У спалучэнні з якімі назоўнікамі прыметнік будзе адносным ці прыналежным, а ў спалучэнні з якімі — якасным?

музычны → інструмент, голас

свінцовая → куля, хмара

залатое → калье, дзяцінства



Правообладатель Национальный институт образования

курыная → памяць, дзюба, катлета

воўчы → хвост, апетыт, кажух

Запішыце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі. З адным словазлучэннем складзіце сказ. Падкрэсліце прыметнік як член сказа.

**Адносныя і прыналежныя прыметнікі могуць пераходзіць у якасныя.**

**У словазлучэнні *срэбны бранзалет* (у значэнні ‘зроблены са срэбра’) прыметнік *срэбны* з’яўляецца адносным, а ў словазлучэнні *срэбны іней* (у значэнні ‘падобны да срэбра’) гэты прыметнік ужываецца ў значэнні якаснага.**

**У словазлучэнні *курыны хвост* (у значэнні ‘хвост, які належыць курыцы’) прыметнік *курыны* з’яўляецца прыналежным, а ў словазлучэнні *курыны розум* (у значэнні ‘розум, як у курыцы’) — якасным.**

**272.** Прачытайце тэкст. Ці можна лічыць яго гумарыстычным?

Саша заўважыў у кантралёра[с] лісіны каўнер і запытаў у мамы:
— Гэта цёця прычапіла лісу, каб яе зайцы баяліся?

*Т. Сучкова.*

Якое значэнне мае слова *лісіны* ў словазлучэнні *лісіны каўнер*: а) ‘які належыць лісе’; б) ‘зроблены з футра лісы’; в) ‘такі, як у лісы’? Назавіце разрад гэтага прыметніка па значэнні.

Складзіце словазлучэнне з прыметнікам *лісіны* ў значэнні ‘*такі, як у лісы*’. У прамым ці пераносным значэнні ўжываецца гэты прыметнік?

***Звярніце ўвагу!***

Прыналежныя прыметнікі могуць пераходзіць у адносныя, калі яны маюць значэнне ‘зроблены з ...’. Прыметнік *воўчае* ў словазлучэнні *воўчае логава* (у значэнні ‘логава, што належыць ваўку’) з’яўляецца прыналежным, а ў словазлучэнні *воўчае футра* (у значэнні ‘футра са скуры ваўка’) — адносным.



Правообладатель Национальный институт образования

**273.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце, да якога разраду адносяцца прыметнікі.

1. Расчасалі[сл] вішні шоўкавыя косы і ўранілі долу снегавы вянок *(П. Трус)*. 2. І над вёскаю далёка чуецца бусліны клёкат *(Г. Аўласенка)*. 3. Малюе мастачка зіма крыштальныя кветкі на шкле і дзівіцца з шыбы сама пры цьмяным, халодным святле *(М. Курыла)*. 4. Наварысты курыны булён яшчэ ў XII стагоддзі лічыўся лекамі супраць грыпу і прастуды *(«Звязда»)*. 5. Так пяе птушыны хор, аж звініць зарэчны бор! *(А. Русак)*.

Якое слова мае значэнне ‘з густым наварам’?

**булён**

## § 45. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне

**274.** Прачытайце тэкст. На колькі сэнсавых частак яго можна падзяліць?

### Чаму снег рыпіць пад нагамі?

Снег складаецца з **найдрабнейшых** часцінак замёрзлай вады. Рыпенне снегу — гэта ўсяго толькі шум ад расціснутых крышталікаў. Рыпіць снег[м] толькі ў мароз. Чым **мацнейшы** мароз, тым **вышэйшая** танальнасць* рыпення. Узмацненне маразоў робіць ледзяныя крышталікі **больш цвёрдымі** і крохкімі.

Калі на двар.. мароз, то ты не змож..ш скачаць снежны к..мяк, таму што снег занадта ра..сыпісты. Вельмі мокры снег таксама не пад..дзе, бо снежная баба стане падобнай да апаленай свечкі *(Паводле А. Чайкі)*.

**крышта́лік**

Запішыце выдзеленыя словы ў пачатковай форме паводле ўзору.

Узор: *найсвятлейшы — светлы, дужэйшы — дужы, больш мяккі — мяккі.*

Спішыце апошні абзац, устаўляючы прапушчаныя літары.

Якасныя прыметнікі могуць мець вышэйшую і найвышэйшую ступені параўнання.

**Вышэйшая ступень параўнання** прыметнікаў паказвае, што ў адным прадмеце якасці больш ці менш у параўнанні


Правообладатель Национальный институт образования